


# МАКАРАНКА
# ПІЛІП ІВАНАВІЧ



Нарадзіўся ў 1906 годзе ў в. Пярэвалачная Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Быў самым старэйшым з сыноў у сям'і Макаранкаў, дзе было сямёра дзяцей: чатыры сыны і тры дачкі.

У Чырвонай Арміі з 1928 года. У 1933 годзе скончыў артылерыйскае вучылішча. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гг.

Айчынная вайна застала П.І. Макаранку на Карэльскім фронце. 3 красавіка 1942 г. па ліпень 1943 г. ён – намеснік камандзіра, камандзір асобнага зенітнага артдывізіёна.

П.І. Макаранка – удзельнік Курскай бітвы. За ўдзел у ёй быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Потым П.І. Макаранка ваяваў на 3-м Украінскім фронце, быў намеснікам камандзіра зенітна-артылерыйскага палка. Удзельнік Яска-Кішынёўскай аперацыі. Пры наступленні полк прыкрываў танкавую брыгаду і вёў бai ў раёне г. Чадыр. Прамой наводкай была знішчана вялікая колькасць варожых танкаў, гармат і пяхоты. За ўмелыя баявыя дзеянні па знішчэнню праціўніка Макаранку было прысвоена званне падпалкоўніка.

Са снежня 1944 года П.І. Макаранка ўзначаліў разведку 3-й Нікапальскай зенітна-артылерыйскай дывізіі, якая ўдзельнічала ў вызваленні Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Венгрыі, вяла цяжкія бai за вызваленне Будапешта.

Дэмабілізаваўся П.І. Макаранка ў 1946 годзе, пэўны час працаваў на савецкай і гаспадарчай рабоце ў Кіеўскай вобласці і Мінску. З 1952 года працягваў службу ў Беларускай ваеннай акрузе. У 1955 годзе выйшаў у адстаўку.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайпы II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Пражываў у Мінску.

**Крыніцы інфармацыі:**

1. **Камандзірская сям'я** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал. І.П. Шамякін [і інш.]. – Мінск, 1988. – С. 322-323.

2. **Макаренко Филипп Иванович**. – Военные архивы : Список : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://podvignaroda.mil.ru.

3. **Сведения о Филиппе Макаренко из учётно-послужной картотеки.** – Память народа : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : pamyat-naroda.su›person›officers›10937330.

FREE-OFFICE.NET